

ПАМЯЦЬ, ЗАХАВАНАЯ Ў ПАРТЫЗАНСКІХ ГАЗЕТАХ 5



ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў БРУНЕІ? 10



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 КРАСАВІКА 2019 г. СУБОТА

№ 65 (28932)




Фота БелТА.

# АЎТАРЫТЭТ ПРАВАСУДДЗЯ НЕЗАЛЕЖНАЙ КРАІНЫ

## Аляксандр Лукашэнка адкрыў будынак Вярхоўнага Суда і правёў нараду па пытаннях судовай дзейнасці

**У фае новага будынка кіраўнік дзяржавы перарэзаў сімвалічную чырвоную стужку, пасля чаго перадаў сімвалічны ключ ад будынка старшыні Вярхоўнага Суда Валянціну Сукалу. Для Прэзідэнта правялі невялікую экскурсію: паказалі залу судовых пасяджэнняў і кабінет суддзяў, а таксама залу Пленума Вярхоўнага Суда. Далей пачалася нарада па пытаннях удасканалення дзейнасці сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі.**

«Вельмі хацеў бы, каб гэта быў светлы, добры, чысты дом для ўсёй судовай сістэмы», — сказаў кіраўнік дзяржавы аб новым будынку, дадаўшы, што хоча, каб ад гэтага будынка была належная аддача. Новы будынак, па словах Прэзідэнта, пабудаваны з «запасам» — велічныя залы стануць таксама пляцоўкай для мерапрыемстваў праваахоўных органаў. «Я хацеў, каб ён быў падобны да Палаца Незалежнасці, у адным стылі, калі гэта сімвал незалежнасці, каб гэта было беларускае. Усё тут зроблена рукамі беларусаў і з беларускіх матэрыялаў, як у Палацы Незалежнасці», — адзначыў ён.

«Сённяшняя падзея — знакавая не толькі для судовай сістэмы, але і для краіны ў цэлым, — падкрэсліў беларускі лідар. — І справа не толькі ў будынку, хоць ён атрымаўся сучасны, функцыянальны. Ён сімвалізуе аўтарытэт судовай улады. Такі і павінен быць палац правасуддзя». Але і не гэта галоўнае. Пабудова такога будынка кажа пра тое, што Беларусь раз і назаўжды ў свой час узяла курс на суверэнітэт і незалежнасць, сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён выказаў надзею, што гэты будынак стане такім жа сімвалам суверэнітэту як Палац Незалежнасці.

### Запыт на сацыяльную справядлівасць

Што да самой нарады, Прэзідэнт адзначыў важнасць таго, што яна праходзіць у пашыраным складзе. Па яго словах, неабходнасць падобнай сустрэчы наспела даўно: з моманту правядзення падобнага мерапрыемства прайшло восем гадоў.

У сваім выступленні Аляксандр Лукашэнка спыніўся на кірунках, якія ідуць «ад жыцця».

Асноўны крытэрый, якім кіруюцца людзі пры ацэнцы работы судоў, — гэта сацыяльная справядлівасць. Прэзідэнт упэўнены, што сацыяльная справядлівасць з'яўляецца не толькі залогам даверу насельніцтва да судоў і правасуддзя, але і найважнейшым складнікам ідэалогіі беларускай дзяржавы. Запыт на гэтую справядлівасць каласальны ва ўсім свеце.

На яго думку, грамадзяне павінны быць упэўнены, што ў судзе знойдуць абарону сваіх правоў і законных інтарэсаў. Гэта значыць, іх праблему пачуюць, паглыбяцца ў жыццёвую сітуацыю. Прымуць аргументаванае і ўзважанае рашэнне. І вельмі важна, каб чалавеку было зразумела, чаму суд вынес менавіта такое рашэнне.

«Людзі, якія прыйшлі ў суд, павінны верыць у яго здольнасць устанавіць ісціну. Тады ім не прыйдзецца ў пошуку праўды звяртацца — ну да каго ж, вядома, пасля суда — зразумела, да Прэзідэнта. Суддзям трэба быць свабоднымі пры прыняцці рашэнняў. Не баяцца пракурораў. Не залежаць ад меркавання следчых. Не азірацца на мясцовую і іншыя ўлады, кіравацца толькі законам», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён звярнуў увагу, што пры гэтым у цэнтры ўвагі суддзяў заўсёды павінен быць чалавек.

«Трэба пераасэнсаваць бачанне сваёй прафесіі. Быць больш уважлівымі да людзей. А часам і ставіць сябе на іх месца. Толькі такі суд будзе па-сапраўднаму аўтарытэтны і справядлівы», — дадаў ён.

### Якасцю, не колькасцю

Другой найважнейшай задачай дзейнасці судовай сістэмы Прэзідэнт назваў фарміраванне моцнага кадравага складу. На яго думку, тут многія пытанні ўжо вырашаныя. Стабілізаваная сітуацыя з цякучасцю кадраў. Павысіўся прэстыж прафесіі і прывабнасць працы суддзі, дзяржава забяспечыла годны ўзровень заработнай платы ў параўнанні з іншымі катэгорыямі, ёсць пэўныя магчымасці для яе павышэння.

«Сёння трэба казаць ужо пра якасць судзейскіх кадраў. Іх належная падрыхтоўка і высокі прафесіяналізм — абавязковая ўмова эфектыўнасці дзейнасці судовай улады, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — У першую чаргу трэба прынцыпова мяняць падыход да кандыдатаў на судзейскія пасады. У суд павінны ісці людзі, якія валодаюць нават не высокімі, а найвышэйшымі маральнымі якасцямі, шырокім кругаглядам, эрудыцыяй і жыццёвым вопытам. Гэта аб'ектыўнае патрабаванне сучаснага грамадства».

Што датычыцца ўзроставага цэнзу для суддзяў — тут судзейскай сістэме трэба вызначыцца самастойна, бо рэдка, але ёсць вопытныя, адказныя, мудрыя і падрыхтаваныя людзі, якія і ў 25 гадоў могуць стаць суддзёй. Узяць той жа вопыт — у якім узросце можна яго атрымаць, пытанне вельмі індывідуальнае, упэўнены кіраўнік дзяржавы.


СТАР. 2




Фота БелТА.

Па палічках

# «ЗЯЛЁНАЯ КАРТКА» — ГАРАНТ НАШАЙ ПЕНСІІ

## Зараз у краіне адкрыта каля 7,7 мільёна картак сацыяльнага страхавання

**Сярэдняя пенсія па ўзросце ў сакавіку склала 393,51 рубля. Сёлета, па звестках Мінпрацы і сацабароны, плануецца падняць сярэдні памер пенсій да 40 % ад сярэдняй зарплаты па краіне. Аб тым, што ўплывае на памер нашых пенсій і чаму трэба задумвацца аб будучай старасці ўжо сёння, а таксама пра зялёную картку сацыяльнага страхавання, расказвае кіраўнік Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА.**

### Пенсіі пажылым «плаціць» маладое пакаленне

У нашай краіне дзейнічае салідарная сістэма дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, у аснове якой ляжыць прынцып узаемадапамогі пакаленняў. Яе можна сфармуляваць так: пакуль мы працуем, са сродкаў, што адлічваюцца намі (а дакладней, нашымі работадаўцамі), плацяцца пенсіі цяперашнім пенсіянерам. Калі мы працаваць не зможам, нашы пенсіі будуць фарміравацца з адлічэнняў новага пакалення.

Аднак гэта не азначае, што ў будучыні памер нашых пенсій будзе залежаць толькі ад маладога пакалення работнікаў, адзначае Наталля Паўлючэнка. Паўплывае і наша працоўная актыўнасць. А менавіта такія два фактары, як працягласць працоўнай дзейнасці і памер заробку, з якога адлічваюцца ўнёскі ў бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Што датычыцца першага фактару, то для прызначэння працоўнай пенсіі ў 2019 годзе патрабуецца мець 17 гадоў працоўнага стажу з выплатай страхавых узносаў (гэта так званы страхавы стаж) і агульны працоўны стаж: мужчынам — 25 гадоў, жанчынам — 20. Штогод патрабаванні да страхавога стажу павялічваюцца на паўгода і ў 2025-м для прызначэння працоўнай пенсіі трэба будзе мець 20 гадоў страхавога стажу.


СТАР. 2


Інавацыі ў адукацыі

# Чаму «буксуе» лічбавая трансфармацыя?

## Ці ў сілах педагог канкурыраваць з інтэрнэтам і размаўляць на мове вучняў...

**По даных даследавання ЕС, у найбліжэйшы час лічбавыя навыкі спатрэбяцца на 9 з 10 працоўных месцаў, але 169 мільёнаў еўрапейцаў ва ўзросце ад 16 да 74 гадоў (або 44 % ад агульнай колькасці) не маюць базавых лічбавых навыкаў.**

Чаму ў Беларусі «буксуе» лічбавізацыя адукацыі? Якой павінна быць школа ў лічбавую эпоху? Пра што трэба клапаціцца найперш — пра наяўнасць у навучальнай установе інтэрнэту на высокіх хуткасцях або пра гатоўнасць педагогаў працаваць з новымі тэхналогіямі? Якімі лічбавымі кампетэнцыямі павінны валодаць вучні і іх настаўнікі? Пра ўсё гэта разважалі ўдзельнікі ІІ Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Лічбавая трансфармацыя адукацыі DTE 2019». Мерапрыемства ўяўляе сабой міжнародную інтэлектуальную пляцоўку для свабоднага абмену ідэямі і вопытам у галіне адукацыі і сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

### Без даведак і справаздач

— У нашай краіне дзейнічае правіла: нельга пытацца пра штосьці двойчы, — падкрэслівае **начальнік аддзела электронных паслуг Міністэрства адукацыі і навукі Эстонскай Рэспублікі Андрэс АРЭМАА.** — Гэта значыць, што калі нейкі сектар ужо валодае інфармацыяй, то іншаму сектару запытваць тую ж самую інфармацыю забаронена.

Трэба растлумачыць, што Эстонія лічыцца адной з самых «прасунутых» у лічбавых тэхналогіях краін свету. Яе яшчэ называюць «тэхналагічнай Меккай». У 2000 годзе эстонскі парламент прыняў закон аб прызнанні доступу да інтэрнэту неад'емным правам чалавека. Рэформы па лічбавізацыі ахапілі абсалютна ўсе сферы грамадства: адукацыю, ахову здароўя, падатковую сістэму, рынак працы і іншыя.

— 99 % усіх сэрвісаў даступныя ў нас анлайн. Ёсць толькі тры сэрвісы, якія такім чынам не дзейнічаюць: нельга заключыць, скасаваць шлюб і набыць жыллё анлайн, — кажа Андрэс. — Выкарыстоўваць усе сэрвісы анлайн грамадзянам дапамагае ID-карта, якая ёсць у кожнага. А з дапамогай мабільнага тэлефона мы можам пакінуць свой лічбавы подпіс.


СТАР. 3


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван ЛАЎРЫНОВІЧ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці:**

*«У Гродзенскай вобласці вырашаны практычна ўсе пытанні, якія паступілі ад жыхароў рэгіёна да «Вялікай размовы». У любой сітуацыі трэба станавіцца на бок грамадзяніна, паглядзець на праблему яго вачыма. Зразумела, што не ўсе пытанні можна зняць імгненна, для вырашэння некаторых патрэбны час, аднак і ў такім выпадку зацягванне на працяглы тэрмін недапушчальнае. Неабходна аргументавана і зразумела тлумачыць людзям прычыны таго ці іншага рашэння, інфармаваць, калі ў рамках закона або з-за эканамічнай неэфектыўнасці зрабіць штосьці ў інтарэсах заяўніка не ўяўляецца магчымым».*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Ілан Маск страціў больш як мільярд долараў за дзве хвіліны

Мільярдэр Ілан Маск страціў 1,1 мільярда долараў за дзве хвіліны пасля адкрыцця таргоў у Нью-Ёрку. Пра гэта паведамляе Bloomberg.

Акцыі яго кампаніі Tesla Inc. абрынуліся на 11 працэнтаў. Гульцы на біржы адрэагавалі такім чынам на навіны пра рэкордныя скарачэнні паставак электрамабіляў да 63 тысяч у першым квартале 2019 года з 90 тысяч у чацвёртым квартале мінулага года. Гэта падзенне акцый скараціла багацце Маска да 22,3 мільярда долараў.

19 лютага Маск размясціў твіт аб планах выпусціць паўмільёна электракараў у 2019 годзе. Камісія па каштоўных паперах (SEC) ЗША палічыла, што гэтае паведамленне можа паўплываць на паводзіны інвестараў. У выніку акцыі кампаніі ўпалі на 5,4 працэнта.

У верасні 2018 года SEC узбудзіла супраць Ілана Маска крымінальную справу. Нагодай стаў твіт аб намеры зрабіць кампанію прыватнай і выкупіць усе акцыі па 420 долараў. Заяўлены кошт быў вышэй за рынкавы, а Маск пасля адмовіўся ад сваіх планаў. Гэта стала падставай западозрыць яго ў махлярстве з мэтай паўплываць на курс акцый. У выніку ён пакінуў пасаду старшыні савета дырэктараў.

### ААН заклікала да будаўніцтва гарадоў, якія плаваюць

Плаваючыя гарады дазволяць чалавецтву пазбегнуць глабальнага затаплення ў выніку змены клімату, заявіла намеснік Генеральнага сакратара ААН Аміна Махамед, выступаючы на мерапрыемстве па тэме дасягнення мэт устойлівага развіцця.

По звестках ААН, амаль 60 % гарадоў з насельніцтвам больш як 300 тысяч чалавек маюць высокую рызыку пацярпець ад цыклонаў, засух, паводак, землятрусаў і вывяржэнняў вулканаў. Прычым у некаторых рэгіёнах такое ўжо адбываецца. «У выніку кліматычных змяненняў павялічваецца рызыка затаплення гарадоў. Паводле некаторых звестак, Бангкок кожны год падтапляецца на два сантыметры, і ўзровень вады ў Сіямскім заліве працягвае падымацца», — канстатавала прадстаўнік сусветнай арганізацыі.

Яна заклікала «будаваць для людзей, а не для аўтамабіляў, будаваць гарады, якія не апынуцца пад вадой у выніку ўздыму ўзроўню мора». «Словам, гарады павінны стаяць на вадзе, а не пад вадой», — сказала Аміна Махамед.

### Трамп лічыць, што ЗША, Кітай і Расія маглі б разам скараціць выдаткі на абарону



Прэзідэнт Дональд Трамп лічыць, што ЗША, Кітай і Расія маглі б дамовіцца аб скарачэнні выдаткаў на абарону і патраціць гэтыя сродкі на нешта іншае.

«ЗША, Кітай і Расія, усе мы ўкладваем мільярды долараў у зброю, уключаючы ядзерную. Я думаю, што ў гэтым няма ніякага сэнсу», — сказаў кіраўнік Белага дома падчас сустрэчы з віцэ-прэм'ерам Дзяржсавета КНР Лю Хэ. «Тры краіны могуць разам сабрацца і спыніць гэтыя траты, пускаць іх на нешта больш прадуктыўнае для дасягнення доўгатэрміновага міру», — адзначыў ён.

Па словах Трампа, дыялог аб скарачэнні выдаткаў на вытворчасць узбраенняў «можа стаць другім этапам» пасля заключэння гандлёвага пагаднення з Кітаем.

«Лічу, што гэта вельмі добрая ідэя», — сказаў віцэ-прэм'ер Дзяржсавета КНР Лю Хэ ў адказ на заяву кіраўніка Белага дома. Трамп падкрэсліў, што зараз няма ніякіх тэрмінаў для магчымага пачатку такога дыялогу.


ISSN 1990 - 763X


## КОРАТКА

- **У Віцебскай вобласці на час пасяўной кампаніі ў дапамогу аграрыям дадаткова прыцягнута 1,5 тысячы чалавек.**
- Захваральнасць на ВРІ і грып у Гомелі за апошнія 10 гадоў знізілася больш чым на 22 %.
- **Міністэрства аховы здароўя прапрацоўвае пытанне правядзення бясплатнай спробы ЭКА для шлюбных пар ва ўзросце да 40 гадоў.**



- Філіп Кіркораў сёння будзе адным з гасцей шоу «Макаёнка, 9» на канале Беларусь 1.
- **Магілёвец з 2013 года ўзяў у доўг у некалькіх чалавек больш як Br160 тыс., але вяртаць не збіраўся. Ён затрыманы, заведзена крымінальная справа.**

# КАРАЦЬ НЕЛЬГА ДАПАМАГАЦЬ

## Нам неабходна сістэма суправаджэння сем'яў з асаблівасцямі

**У нашай краіне ў цэлым нядрэнна выбудавана сістэма падтрымкі неўладкаваных сем'яў з дзецьмі. Калі размова ідзе пра залежных бацькоў. Але ёсць іншая катэгорыя сем'яў. Яны вельмі розныя, але маюць дзве агульныя рысы: бацькі ў іх не злоўжываюць алкаголем, але ім пастаўлены той або іншы... дыягназ.**



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Сям'я М. стварылася 15 гадоў таму. «Я Наташу адразу палюбіў, — прызнаецца Аляксандр. — Пажаніліся, і жонка зацяжарала двайнятамі. У нас нарадзіліся два сыны».

Роды ў Наталлі былі цяжкімі... Хлопцы з'явіліся на свет неданошанымі. Праблемы пачаліся амаль адразу. Дзеці хварэлі і часта плакалі.

«Нягледзячы на тое, што нам дапамагала бабуля Наталлі, у якой мы жылі, — я памятаю, што мы ўсе не высыпаліся. Досведу ў выхаванні здаровых дзяцей у нас не было, не тое што хворых. Нам было вельмі цяжка», — успамінае Аляксандр. Яшчэ ў радзільні маладых бацькоў папярэджвалі, што з Кірылам і Сашам (так назвалі двайнят) будуць цяжкасці.


СТАР. 4